Свіслаччына – самабытны куточак Гродзеншчыны. Большая частка яе размешчана ў незвычайным месцы: на тэрыторыі нацыянальнага парка “Белавежская пушча”, што з’яўляецца своеасаблівым сімвалам, візітнай карткай нашай краіны, гордасцю беларускага народа. У цяперашні час, калі бурнымі тэмпамі развіваецца этнатурызм, экатурызм, наша малая радзіма здзіўляе наведвальнікаў не толькі прыгажосцю краявідаў, працавітасцю, гасціннасцю і шчырасцю яе жыхароў, чысцінёй, утульнасцю вёсачак, але нават трапнасцю, дакладнасцю, мілагучнасцю мясцовых назваў і архітэктурных збудаванняў, якія ўвасобілі ў сабе ўсю прыгажосць і непаўторнасць гэтага пушчанскага краю.

Уся зямля беларуская ўсыпана прыгожымі зоркамі-дыяментамі, старажытнымі помнікамі архітэктуры - гэта і Мірскі замак, і Нясвіжскі

Радзівілаў, Навагрудская княжацкая рэзідэнцыя ў выглядзе крэпасці-ўмацавання, светлая Каложа над Нёманам і Траецкае прадмесце ў Мінску, таксама Жыровіцкі манастыр, Спаса-Еўфрасіннеўская царква ў Полацку і многія іншыя. Помнікі гэтыя - мураваны летапіс, які лепш за любую машыну часу перанясе цябе ў мінулае, у далёкія часы нашых продкаў.

Архітэктура Беларусі - гэта летапіс народа ў дрэве і камені. Старажытныя замкі, ратушы, храмы з'яўляюцца адбіткам таленту народа. Архітэктурная спадчына Беларусі - невычарпальны калодзеж творчай фантазіі многіх пакаленняў, якія на працягу стагоддзяў стваралі непаўторны вобраз краіны.

Ці ведаеце вы, што некалі на тэрыторыі Беларусі існавала каля тысячы храмаў: замкаў, палацаў, касцёлаў, цэркваў, кляштараў? Калі згадзіцца з выказваннем, што архітэктура – гэта застылая музыка, дык наша краіна можа па праву лічыцца адной з самых музычных.

У даўніну, пяць або шэсць стагоддзяў назад, падарожнікі, якім выпадала ехаць праз Беларусь, амаль праз кожныя 10—15 кіламетраў бачылі магутныя сцены храмаў. Яны стаялі на варце дзяржаўнай бяспекі.

На тэрыторыі невялікага Свіслацкага раёна, які знаходзіцца ў Гродзенскай вобласці, у 20 стагоддзі мірна суіснавалі людзі розных канфесій: праваслаўнай, каталіцкай і іўдзейскай.

Аднак гісторыя храмаў зведала розныя перыяды развіцця. Але ва ўсе часы яны паказвалі сілу, моц, дух дзяржавы. На жаль, бязлітасны ход гісторыі прывёў да таго, што ў іх адчыняліся калгасныя канторы, склады, свінакомплексы. Ад сівой мінуўшчыны засталіся скупыя рэшткі колішніх збудаванняў. Аб такіх зніклых храмах вы даведаецеся з нашага гістарычнага экскурса, задачы якога заключаюцца ў наступным: пазнаёміць навучэнцаў з гісторыяй страчанай храмавай архітэктурнай спадчыны Свіслаччыны XVII - I паловы XX стст.; вызначыць асноўныя рысы, асаблівасці і значэнне храмаў для свіслацкай зямлі; развіваць цікавасць да ведаў пра страчаныя храмы, матывацыю да вывучэння духоўнай культуры роднага краю; выхоўваць каштоўнаснае стаўленне да духоўнай, гістарычнай і культурнай спадчыны малой радзімы.

Касцёл Яна Хрысціцеля пры кляштары францысканцаў.



Быў пабудаваны ў в. Грынявічы ў 1792 г. манахамі. Будынак спланаваны па рымска-каталіцкім каноне ў выглядзе трохнефавай базілікі. На магутнай аркадзе пры ўваходзе пакоіцца прасторная галерэя хораў, прызначаная для аргана. Як і знадворку храма, яго ўнутраны дэкор заснаваны на спалучэнні вертыкальна працягнутых уздоўж сцен карнізаў (Фота 1.).

У сувязі з ганеннем на каталіцызм у 1870 г. касцёл быў пераасвечаны ў праваслаўную царкву. Захаваліся фрагменты мураванай агароджы і брама XVIII стагоддзя ў напаўзруйнаваным стане.

Манументальны мураваны храм - помнік архітэктуры барока, яго завяршальнай стадыі развіцця. Майстры барока імкнуліся асноўны архітэктурна-дэкаратыўны акцэнт стварыць на галоўным фасадзе, які тут



выступае пукатай, насычанай пластыкай сцяной, - лапаткі, нішы, прафіліроўкі.

Храм трохнефавы, базілікальны, з бязвежавым фасадам і прамавугольнай апсідай. Накрыты пакатым (раней высокім) двухсхільным дахам (Фота 2). Крывалінейны галоўны фасад трох’ярусны, дэкарыраваны карнізнымі паячамі, спаранымі пілястрамі і завершаны фігурным франтонам.

Дзверы галоўнага ўваходе з каванымі фігурнымі накладкамі. Інтэр’ер меў выцягнутую па падоўжанай восі кампазіцыю. Галоўны неф перакрыты цыліндрычным скляпеннем з люнетамі, бакавыя – плоскія з драўлянымі перакрыццямі. Над уваходам размешчаны хоры. Сцены расчлянёны спаранымі пілястрамі і шырокім карнізным поясам. З высокай пласцінай галоўнага фасада схаваны “карабель” храма, які характарызуецца буйнамаштабнасцю, аскетызмам дэкору масіўных архітэктурных аб’ёмаў.

З перабудовай храма пад царкву яго барочная архітэктура набыла элементы старажытнарускага дойлідства – цыбулепадобныя купалы і макаўкі, кілепадобны шчыт над франтальным фасадам і такія ж абрамленні арачных аконных праёмаў. Ад будынка касцёла захаваліся сцены, дзверы з каванымі накладкамі, фрагменты мураванай агароджы і брама XVIII стагоддзя (Фота 3-4).





Фота 5.Выгляд касцёла на фотаздымку 1870 –х гадоў





Фота 6 .Выгляд пасля перабудовы пад праваслаўную царкву, 1870 –я гады Фота Mariusz Pro

Крыніца: *Кулагін А. М. Каталіцкія храмы Беларусі : Энцыкл. даведнік / А. М. Кулагін; фатограф А. Л. Дыбоўскі. — 2-е выд. — Мінск : БелЭн, 2008. — 488 с.*

У XVII стагоддзі тут уладарылі магнаты Агінскія. Шматлікія маёнткі сям'і Самуіла Льва Агінскага былі раскіданы як у Літве, так і ў Беларусі. Дарэчы, праўнук Самуіла Льва Міхаіл Казімір (1731-1800) – вялікі гетман Вялікага княства Літоўскага, кандыдат на карону караля Рэчы Паспалітай у 1764 годзе, будаўнік канала Агінскага, знаток музыкі і выяўленчага мастацтва, мецэнат тэатра, а таксама Міхаіл Клеафас Агінскі (1765-1833) – вядомы кампазітар, аўтар бессмяротнага паланэза «Развітанне з радзімай», у некаторай ступені з'яўляюцца землякамі Ваўкавышчыны.

Адзін з маёнткаў Агінскіх быў у Вялікай Лапеніцы. У 1620 годзе ў Самуіла Льва Агінскага нарадзіўся сын Ян (Яцэк), які і стаў уладальнікам В.Лапеніцы пасля смерці бацькі. Ян закончыў Кракаўскую акадэмію, пасля якой вельмі хутка пачаў узнімацца па ваеннай і адміністрацыйнай лесвіцы. У 1650-м ён харунжы Ваўкавыскага павета. Праз 7 гадоў – маршалак Ваўкавыска, з 1668-га – польскі пісар ВКЛ. Ваяваў са шведамі. Стаў ваяводам Полацкім і адначасова гетманам польным (намеснікам галоўнакамандуючага) ВКЛ.

А потым, у 1683-м, Ян Агінскі пад камандаваннем гетмана Літоўскага Казіміра Сапегі і караля Польшчы Яна III Сабескага ўдзельнічаў у разгроме туркаў пад Венай, каб спыніць агрэсію Асманскай імперыі ў Еўропе. І ў гонар перамогі Ян Агінскі ахвяраваў са сваёй казны дзесяць тысяч залатых на будаўніцтва ў маёнтку Вялікая Лапеніца францысканскага манастыра.

Але пасля Венскага паходу ён захварэў і памёр у Кракаве. Было гэта ў 1684 годзе. Будаўніцтва манастыра пачалося ў 1690-м і закончылася толькі праз 102 гады, у 1792 годзе.

У 1835 годзе манастыр быў часткова перабудаваны і перададзены ў духоўнае ведамства яго імператарскай вялікасці. Да 1870 года касцёл

францысканскага манастыра быў перабудаваны ў пяцікупальную праваслаўную царкву. Вось што гаворыцца пра яе ў энцыклапедычным даведніку А.М.Кулагіна «Праваслаўныя храмы Беларусі» (Беларуская энцыклапедыя. Мн., 2001, с.65): «Грынявіцкая царква на паўночнай ускраіне вёскі…Манументальны мураваны храм – помнік архітэктуры барока, яго завяршальнай стадыі развіцця…З перабудовай храма пад царкву яго барочная архітэктура набыла элементы старажытнарускага дойлідства – цыбулепадобныя купалы і макаўкі, кілепадобны шчыт над франтальным фасадам і такія ж абрамленні арачных аконных праёмаў…»

Пасля 1920-га храм стаў каталіцкім, а калі Заходняя Беларусь уз'ядналася з Усходняй, у другі раз – праваслаўным, які дзейнічаў да 1965-га, пакуль адпаведная камісія не «знайшла» нейкую трэшчыну ў скляпенні. Храм закрылі дзеля бяспекі вернікаў. Дах і скляпенне паступова разбураліся.

У васьмідзесятыя гады мінулага стагоддзя храм перайшоў на баланс мясцовага (цяпер былога) саўгаса «Гарнастаевічы» Свіслацкага раёна. Праведзеная «рэканструкцыя» амаль напалову разбурыла яго. Не толькі быў зняты дах, з-за якога пашкоджаны верхнія вокны і сцены, але і завалены фамільныя скляпы Агінскіх. У іх, як сведчаць гістарычныя дакументы, быў пахаваны сын вышэйзгаданага Яна Агінскага – Грыгорый, герой Палтаўскай бітвы. Ён камандаваў трыма расійскімі палкамі Баура і Рэпніна і атрымаў за гэту бітву тытул Вялікага Гетмана, быў узнагароджаны ордэнам Белага Арла. З рускім атрадам Меншыкава адправіўся ў польскі горад Люблін. Там раптоўна захварэў і 17 снежня 1709 года памёр. Яго прах тут, на радзіме…

У 1989 годзе праваслаўныя вернікі бліжэйшых да храма вёсак вырашылі яго адбудаваць. Нават сабралі пэўныя грашовыя сродкі. Але па розных прычынах добрая справа не ажыццявілася…

Праз уваходную браму трапляем на тэрыторыю храма, якая перад яго цэнтральнымі варотамі абкошана. Высокая пласціна галоўнага фасада, за якой калісьці быў схаваны «карабель» храма, а ён да разбурэння быў сапраўды падобны на магутны і горды карабель, абсыпалася. Адкрыць вялізныя шырокія

дзверы няцяжка: яны ўжо даўно не бачылі замкоў-ахоўнікаў. На дзвярах прымацавана шыльда «Гісторыка-культурная каштоўнасць. Касцёл былога кляштара францысканцаў XVIII ст. Прычыненне шкоды караецца па закону».

Пры ўваходзе на магутнай аркадзе відны рэшткі прасторнай галерэі хораў, якая спачатку прызначалася для аргана, а потым і для пеўчых. Бягучыя ўздоўж сцен складана прафіляваныя карнізы пабіты і абсыпаліся. Бакавыя нішы завалены цэглай.

…Ад маёнтка Агінскіх захаваліся на былой алеі некалькі серабрыстых векавых таполяў ды вось гэты разбураны францысканскі кляштар – сведкі былой славы і магутнасці старажытнага роду.

А некаторых храмаў Свіслаччыны не захавалася з прычыны ваенных падзей XIX-XX стагоддзя. Да ліку такіх на тэрыторыі Свіслацкага раёна адносіцца Свята-Ануфрыеўская царква ў аграгарадку Ціхаволя, царква Прысвятой Багародзіцы, грэка-каталіцкая царква Анёла-Ахоўніка і касцёл Святой Троіцы ў горадзе Свіслач, касцёл піяраў у вёсцы Ятвеск.

Ціхавольская Свята-Ануфрыеўская царква

Даўнюю і цікавую гісторыю мае царква, якая была ўзведзена на ўзвышаным месцы ў паўночна-заходняй частцы вёскі Ціхаволя.

Мясцовыя жыхары сцвярджаюць, што яна была ўніяцкай. Узнікае пытанне пра дату будаўніцтва храма. Верагодна, царква была пабудавана як праваслаўная. Пасля падпісання царкоўнай Берасцейскай уніі 1596 года стала ўніяцкай. У 1839 годзе Полацкі царкоўны сабор прыняў рашэнне аб ўз'яднанні ўніяцкай царквы з праваслаўнай.



У выніку царква стала праваслаўнай. Гэта пацвярджае кліравая ведамасць Дабравольскай парафіяльнай царквы 1870 года, у якой называюцца бліжэйшыя праваслаўныя храмы, сярод іх і Ціхавольская царква.



составленъ въ 1875 году 21 Мая б. Волковыскимъ Благочиннымъ Священникомъ Пономаревымъ Симеономъ хранится при Большой церкви въ городѣ. Всего церковного земельного клина, причта владѣютъ сами. –

8.) Описъ для Августовской деревянной не-вполнѣ удобной, построенъ б. Полскаго Государственнаго Имущества въ 1861 году; всѣ же хозяйственныя постройки для него, какъ-то: амбаръ, погребъ, вновь построенныя въ 1902 году, гумно, хлѣвъ для скота и помѣщения деревянныя, построены въ 1871 году на счетъ попа; всѣ хозяйственныя постройки ремонтированы Священникомъ Калачевскимъ на собственныя средства. Домъ Священника требуетъ неотложнаго капитальнаго ремонта. Домъ Псаломщика равно какъ и всѣ хозяйственныя постройки для него, какъ-то: амбаръ съ кашетинкой погребомъ подъ нимъ гумно и хлѣвъ для скота деревянныя, построены въ 1882 году на счетъ попа; требуютъ капитальнаго ремонта. Всѣ эти причтовыя строенія приняты отъ Церкви Б. г. Мировичъ Посредниковъ и переданы въ Духовное Вѣдомство 15 іюля 1883 года. Затѣмъ отъ дому Священника въ 1888 году на счетъ попа пристроена одна комната, сдѣлана готическая крыша на всѣхъ домахъ, стѣны его снаружи обшиты досками, а внутри вштукатурены, что такожде принято отъ Церкви и передано въ Духовное Вѣдомство. Зданій принадлежащихъ церкви нѣтъ. –

9.) Разстоянія церковныя отъ Гродненской Духовной Консисторіи въ 48 верстахъ, отъ Уѣзднаго города Волковыска въ 42 верстахъ, отъ мѣстечка Благочиннаго въ 42 верстахъ, отъ ближайшей почтовой станціи „Свислочь" въ 16 верстахъ, отъ ближайшей желѣзно-дорожной станціи Берестовица въ 28 верстахъ.

10.) Ближайшія отъ ней церкви: Янковская въ 10 верстахъ, Яловская въ 14 верстахъ и Тиховольская, Пружанскаго уѣзда, въ 6 верстахъ; Иновѣрческихъ храмовъ въ предѣлахъ прихода нѣтъ. –

11.) Пришской церкви въ приходѣ нѣтъ. –

12.) Большовой церкви въ приходѣ нѣтъ. –

13.) Описъ церковному имуществу, утвержденный и печатью скрѣпленъ Литовской Духовной Консисторіи 15 февраля 1872 года, хранится при Большой церкви въ церковности. –

14.) Приходо-расходныя книги съ 1844 г. за шнурами и печатью Литовской Духовной Консисторіи, а равно и за послѣдніе трехлѣтія съ 1902 г. по 1904 г. выданныя изъ Гродненской Духовной Консисторіи отъ 24 ноября 1900 года за № 7078, вѣдутся исправно и хранятся въ церкви въ цѣлости. –

15.) Копіевая метрическая книга истребленъ пожаромъ въ б. Мировичской Духовной Консисторіи, а нынѣшнія съ 1822 года по настоящій и хранятся въ церкви въ цѣлости. –

Кліравая ведамасць Дабравольскай парафіяльнай царквы 1870 года

У Гродзенскім нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ўтрымліваюцца метрычныя кнігі Ціхавольскага прыходу з 1843 года па 1873 год.

Па словах мясцовых жыхароў і захаваным фотаздымку, царква была драўляная, з бруса, дошкай не абабітая. Аднакупальная. Храм праіснаваў да 1944 года. У гады Вялікай Айчыннай вайны нямецка-фашысцкія захопнікі перад адыходам спалілі вёску і царкву. Захаваўся купальны крыж, які ў цяперашні час знаходзіцца на тэрыторыі Царквы Пакрова Прасвятой Багародзіцы ў вёсцы Яцвеск (Фота 6). У царкве Успення Найсвяцейшай Багародзіцы вёскі Дабраволя знаходзяцца абразы з Ціхавольскай царквы, якія паспелі выратаваць мясцовыя жыхары. У дадзены час на месцы царквы знаходзіцца будынак Ціхавольскага дома фальклору.



Ціхавольская Свята-Ануфрыеўская царква. Фотаздымак 40-х гг. XX



Фота 6. Купальны крыж Ціхавольскай Свята-Ануфрыеўскай царквы, які ў цяперашні час знаходзіцца на тэрыторыі Царквы Пакрова Прасвятой Багародзіцы ў вёсцы Яцвеск Свіслацкага раёна

Касцёл Святой Троіцы (Траецкі касцёл) у Свіслачы

У 1667 годзе ўладаром мястэчка Свіслач быў прусак Крышпін-Кіршэнштэйн. У 1668годзе тут збудавалі Траецкі касцёл, пры якім дзейнічала парафіяльная школа.

Знаходзіўся ў цэнтры мястэчка, на былой Гімназічнай плошчы. Перад касцёлам стаяла вежападобная шмат’ярусная званіца. Вядомы па акварэлі Н.Орды 1868 г.



З’яўляўся творам народнага дойлідства. Храм быў вырашаны прамавугольным зрубам з 3-граннай апсідай, 2-схільны гонтавы дах, над якой пераходзіў у вальмавы і завяршаўся сігнатуркай. Над галоўным фасадам узвышалася 2-ярусная чацверыковая шатровая званіца. Асіметрыю ў кампазіцыю будынка ўносіла бакавая прамавугольная сакрысція. Вертыкальна ашаляваныя фасады былі прарэзаны прамавугольнымі аконнымі праёмамі.

Вуліца Брэсцкая была шырэйшая за астатнія і ўяўляла сабою працяг Гродзенскай вуліцы ў паўднёвым напрамку. Гэтую вуліцу на адным са сваіх малюнкаў адлюстраваў Напалеон Орда ў 1868 г. Гэты ж мастак захаваў для нас надзвычай прыгожую і шырокавядомую па паштоўках міжваеннай Польшчы выяву касцёла Святой Троіцы ў Свіслачы. Першая згадка каталіцкага храма ў Свіслачы датычыцца XV ст. Касцёл знаходзіўся на рагу вуліц Дворнай і Брэсцкай. Адразу за касцёлам, у бок вуліцы Дворнай, знаходзілася высокая вежа званніцы; за званніцай – гімназічныя гмахі.

А. Мялешка піша, што даўжыня будынка складала 27 метраў, а шырыня – 13. Над ім узвышалася высокая вежа, на якой яшчэ ў пачатку XIX ст. стаяў вежавы гадзіннік, а ў 12 гадзін дня паліла гармата. Даследчыца В. Князева падае, што ў пачатку XIX ст. вакол касцёла знаходзіліся агароджаныя плотам могілкі. Дакументы сапраўды пацвярджаюць гэты факт і падаюць, што касцёльны некропаль меў форму ромба. Дэтальнае даследаванне гісторыі і мастацкай праблематыкі гэтага касцёла правёў даследчык М. Зглінскі.

Калі б мы раптам апынуліся ў пачатку XIX стагоддзя ў Свіслачы і паспрабавалі б з якога-небудзь боку наблізіцца да мястэчка, то ў першую чаргу заўважылі менавіта касцёльныя вежу і званіцу, якія дамінавалі па-над мястэчкам і былі самымі высокімі тут збудаваннямі. У тыя часы ў касцёл хадзілі не толькі з патрэб рэлігійных, але і з мэтай абмяняцца навінамі або сустрэць знаёмых. Выхад у касцёл быў добрай нагодай дзяўчынам апрануць новую сукенку і прымерыць свае пярсцёнкі.

Цікавая гісторыя гэтага касцёла. У 1668 годзе Кіршанштэйн з парады і пад націскам сваёй жонкі Ганны з Млоцка (Млоцкай) прафінансаваў будову новага касцёла пад назвай Святой Троіцы. Асвячэнне гэтага помніка драўлянага дойлідства адбылося 22 красавіка 1668 года жмудскім біскупам Казімірам Пацам. Менавіта адсюль бярэ свой пачатак гісторыя касцёла Святой Тройцы, які праіснаваў пад гэтай назвай з сярэдзіны XVII ст. амаль да сярэдзіны XX ст., ажно да свайго знішчэння пажарам ў 1944 годзе. Паколькі першапачаткова касцёл будаваўся з дрэва (лістоўніца), то ў 1742 годзе быў рэстаўраваны на сродкі Тэрэзы Крышпінавай, кашталянкі троцкай.



Выява будынка святыні нам вядома з малюнка Напалеона Орды (каля 1811 г.), малюнкаў краязнаўцы Вітольда Карпызы (пачатак 1930-х гг.) і некаторых іншых ілюстрацый. Асабліва каштоўныя ў інфармацыйным сэнсе малюнкі Карпызы: узяты нетыповы ракурс і касцёл паказаны з тылу. Яшчэ больш цікавы наступны малюнак, на якім адлюстраваны касцёльны інтэр’ер і які дазваляе «зазірнуць» ва ўнутраную частку будынка.



Малюнак В.Карпызы, пачатак 1930 гг.

Царква Прасвятой Багародзіцы ў Свіслачы

Гэта быў галоўны праваслаўны храм мястэчка XIX стагоддзя, першыя звесткі аб існаванні якога адносяцца да XVI стагоддзя. Вядома, што царква два разы перабудоўвалася. Падчас рэканструкцыі Свіслачы ў 1782 годзе Вікенціем Тышкевічам царкву перанеслі на іншае месца. Будавалася яна некалькі гадоў, і ўрачыстае адкрыццё адбылася 8 верасня 1788 года ў гонар Прасвятой Багародзіцы.



Свіслачы.

Яна размяшчалася на ўзвышшы, агароджа драўляная. Галоўны ўваход у храм меў невялікую арку-званіцу з каменю.

На жаль, храм згарэў разам з архівам, які вёўся з 1775 года, у чэрвеньскім пажары 1941 года.



Царква Прасвятой Багародзіцы ў Свіслачы. Фота 30-я гады XXст.



Царква Прасвятой Багародзіцы ў Свіслачы. Малюнак Вітольда Карпызы

Касцёл Анёла-Ахоўніка

У самой жа Свіслачы па вуліцы Брэсцкай (цяпер вуліца Леніна) з другой паловы XIX ст. знаходзілася драўляная капліца Анёла-Ахоўніка – ратондападобнае гранёнае збудаванне пад шатровым дахам з глаўкай, якое стаяла паміж дзвюх брам.



Касцёл Анёла-Ахоўніка. Малюнак Вітольда Карпызы

Упершыню капліца згадваецца ў першай палове XVIII ст. Дакумент 1732 г. падае, што яе фундатарам быў старадубскі суддзя Жыгімонт Біспінг. У 1805 г. будынак быў адрамантаваны, а ў 1834 г. замены патрабавалі толькі вокны. У 1898 г. планавалася зрабіць капітальны рамонт гэтага будынку, аднак заменена было толькі гонтавае пакрыццё даху. Капліца ўяўляла сабою невялікі прамавугольны драўляны будынак на каменным падмурку. Ашаляваны будынак быў звернуты фронтам на поўнач.

Прамавугольныя дзверы складаліся з двух «крылаў». Над уваходам і ў бакавых сценах меліся паўкруглыя вокны. Ганак быў аформлены невялікім порцікам з чатырма калонамі (Дадатак 10). Над двускатным дахам знаходзілася невялікая вежачка: чацвярык на кубічным цокале, аздоблены крыжам.



Вуліца, на якой знаходзіўся касцёл Анёла-Ахоўніка. Малюнак Вітольда Карпызы

У капліцы Анёла-Ахоўніка некалькі разоў на год адпраўлялася набажэнства. Леан Патоцкі ў сваіх успамінах піша: «Побач з капліцай Анёла-Ахоўніка, за Брэсцкаю брамаю, - дворыкі, прызначаныя для пенсіянераў. Адзін з іх, італьянскай архітэктуры, аздоблены ўнутры відамі Рыму і Неапаля, называўся «Віла» [16, с. 28].

Пасля Першай сусветнай вайны капліцы ў Грынках і Рудні ўжо не ўзгадваюцца, затое капліца Святога Анёла-Ахоўніка атрымала статус філіяльнага касцёла. Храм быў спалены пры вызваленні горада летам 1944 года.

Касцёл піяраў у Яцвеску.

Вядома толькі тое, што быў пабудаваны ў 1756 годзе, зачынены ў 1849, а зруйнаваны ў 1872 г. Звесткі атрыманы з фондаў Віленскага ўніверсітэта. Выгляд храма захаваўся на малюнку С.І.Кудраўцова.



Касцёл піяраў. Малюнак С.І. Кудраўцава.

Трэба адзначыць, што іўдзейская канфесія на Свіслаччыне прадстаўлена будынкамі сінагог у мястэчках Свіслач і Поразава.

Да саракавых гадоў мінулага стагоддзя мястэчка Поразава налічвала каля 3000 жыхароў, з іх трэць былі яўрэі. Зямлі яны не мелі. Займаліся абслугоўваннем насельніцтва. Так, Янкель Каладзіцкі валодаў млыном, іх у Поразава было два. Шмуіл Карасік меў мануфактурную краму. Яўрэі ўтрымлівалі дзве кузні. Адной з іх валодаў Хаім. Як успамінаюць старажылы, кавалі яны былі добрыя. Калі Хаім "адцягваў" сякеру, то ёй можна было



галіцца. Яўрэі ўтрымлівалі дзве аптэкі. Сярод іх былі лекары, краўцы, кулінары. А Мунька Мэйшка займаўся перавозам тавараў. У яго было два кані. Ён дастаўляў тавары для сваіх супляменнікаў з Ваўкавыска, Беластока і іншых месцаў.

У мястэчку Поразава таксама размяшчалася дзве сінагогі, пабудаваныя ў XIX стагоддзі. Абедзве згарэлі падчас вайны. Праўда, будынак каменнай быў адноўлены і прыстасаваны пад склад (Фота 7). У дадзены момант будынак сінагогі не выкарыстоўваецца, таму дадзены вельмі цікавы і важны архітэктурны помнік павольна руйнуецца.



Выгляд будынка (унутры) сінагогі з бутавага каменю. Фота XXI ст.



. Выгляд будынка (спераду) сінагогі з бутавага каменю. Фота XXI ст.
Будынак сінагогі ў г.п Поразава



юнак

Заключэнне

За часы свайго існавання беларускі народ стварыў выдатную гістарычную спадчыну. Архітэктура мястэчка Свіслач з'яўляецца яе складаючай часткай, якой належыць асаблівае месца ў агульнакультурным кантэксце. Абумоўлена гэта тым, што архітэктура знаходзіцца на памежжы матэрыяльнай і духоўнай культуры, адначасова ўвасабляе ў сабе мастацкія элементы з непасрэдным грамадскім прызначэннем.

На сённяшні дзень шмат зроблена і робіцца ў Беларусі, каб аднавіць храмы моцы і прыгажосці. Прыйдзе дзень, калі загучаць галасы адноўленых збудаванняў для таго, каб кожны з нас мог з гонарам пахваліцца: “Мае продкі ўмелі будаваць такую прыгажосць, з якой мала што на зямлі можа параўнацца”.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Кулажанка, Л.Я. Праваслаўныя святыні на Беларусі: дапам. для настаўнікаў гісторыі і выкладчыкаў курса рэлігіязнаўства / Л.Я.Кулажанка. - Мн., Бел. навука, 2005. - 244 с.

2. Мялешка, А. З гісторыі канфесійнага становішча на Свіслаччыне / А. Мялешка // Старонкі гісторыі Свіслацкага краю: матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі / пад рэд. І.П. Крэня. - Гродна: ГрДУ, 2001. - С. 169 - 174.

3. Памяць. Свіслацкі раён: Гістарычна-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / Рэдкал. І.І.Варанец і інш.; Маст. Э.Э.Жакевіч. – Мінск: Беларусь, 2004 г. - 526 с.

4. Раманаў, С. Касцёл Святой Тройцы // Свіслацкая газета. - 2009. – 6 верасня. – С.3

5. Соркіна, І. Мястэчка Свіслач у першай палове XIX ст. /І.В. Соркіна // Старонкі гісторыі Свіслацкага краю : Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі 23 мая 1998 г. г. Свіслач/пад рэд. І.П. Крэнь. - Гродна: ГрДУ,2001. – С.48-61 Рэжым доступу: file:///C:/Users/Admin/Downloads/94975pdf%20(3).pdf – Дата доступу: 08.10.2019.

ПРИЛОЖЕНИЕ 3

Праваслаўныя святыні Гродзеншчыны

Канспект занятка па адукацыйнай вобласці “Асновы праваслаўнай культуры” для 11 класа

Урбановіч Зоя Аляксандраўна, настаўнік беларускай мовы і літаратуры першай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі “Вучэбна-педагагічны комплекс Дабравольскі дзіцячы сад-сярэдняя школа” Свіслацкага раёна Гродзенскай вобласці, педагог, які уддзельнічае у рэалізацыі інавацыйнага праекта “Укараненне мадэлі маральнага развіцця навучэнцаў у сучаснай адукацыйнай прасторы на праваслаўных традыцыях і каштоўнасцях беларускага народа з улікам рэгіянальнага сацыякультурнага кластара”.

Мэта: выхаванне каштоўнаснага стаўлення да духоўнай, гістарычнай і культурнай спадчыны роднай зямлі.

Задачы:

- ствараць умовы для фарміравання духоўных каштоўнасцяў паважлівых адносін да святых месцаў;
- развіваць прасторавыя ўяўленні, лагічнае мысленне;
- развіваць інфармацыйную кампетэнтнасць на аснове ўключэння новых слоў і паняццяў ва ўласны слоўнікавы запас;
- замацоўваць уменні ажыццяўляць аналіз аб'ектаў духоўнай культуры з вылучэннем галоўнага, істотнага.

Вучэбна-наглядны комплекс:

- праектар, экран, дошка, ілюстрацыйны матэрыял, паведамленні.

Віды дзейнасці:

-апытанне, адказы на пытанні, гутарка, аповед, праца з ілюстрацыйным матэрыялам.

Слоўнік.

А. Царква - архітэктурнае збудаванне, прызначанае для здзяйснення набажэнстваў і рэлігійных абрадаў; храм у праваслаўі.

Б. Абраз - малюнак, вобраз, выява – выява твараў, падзей святой ці царкоўнай гісторыі, што з'яўляецца прадметам ушанавання.

В. Святыя збудаванні – гэта адмыслова створаныя збудаванні для супольных рытуальных дзеянняў.

Г. Рэлігія - злучаць, уз'ядноўваць, набожнасць, святыня. Прадмет культу- вера ў звышнатуральнае (у Бога) - сукупнасць поглядаў і ўяўленняў, сістэма вераванняў і абрадаў, што аб'ядноўвае людзей. Адна з уласцівых культуры формаў прыстасавання чалавека да навакольнага свету, задавальненні яго духоўных патрэб.

Папярэдняя работа: вучні загадзя рыхтуюць паведамленні з прэзентацыяй пра святыя мясціны гродзенскай зямлі: Каложская царква, царква ў гонар архістраціга Міхаіла (Сынковіцкая царква), Жыро́віцкі Свята-Успенскі манасты́р, Богаяўленская царква ў Жыровічах, Царква Раства Багародзіцы, а таксама пра святых Антонія, Іаана і Яўстафія і мучаніка Гаўрыіла Беластоцкага.

Ход урока

1. Арганізацыйны момант. Стварэнне спрыяльнай атмасферы ў пачатку ўрока.

Я жадаю вам поспеху на ўроку. Пажадайце і вы адзін аднаму плённай працы, усміхніцеся мне, усміхніцеся таварышу. Хай ад гэтай усмешкі стане цяплей на душы, хай яна дапаможа лёгка і радасна працаваць на занятку, створыць добры настрой.

2. Псіхалагічная настроенасць на ўрок.

Настаўнік. Пачаць урок я хачу прытчай “Іголка ў стозе сена”. Паслухайце, калі ласка.Аднойчы ў аднаго мудрага і разумнага чалавека спыталі, у чым ён бачыць асноўнае адрозненне паміж уласным розумам і розумам іншых людзей. Ён задумаўся, а потым сказаў: “ Калі людзі шукаюць іголку ў стозе сена, то большасць спыняецца, як толькі знойдзе яе. А я працягваю пошукі, знаходзячы другую, трэцюю, і, магчыма, калі мне вельмі пашанцуе, нават чацвёртую і пятую іголкі”. Я жадаю вам на сённяшнім уроку знайсці чарговую, але не апошнюю іголку ў стозе сена.

3. Маўленчая зарадка. Чытанне слоўніка і тлумачэнне сэнсу слоў

4. Актуалізацыя разумовай дзейнасці.

Настаўнік. А зараз я хачу праверыць, колькі іголак вы назбіралі на папярэдніх уроках.

- Што пазначае слова «рэлігія».

- Спачатку рэлігія пазначала прыхільнасць чалавека да чаго-небудзь святога, сталаму, нязменнаму. Гэты тэрмін увайшоў ва ўжытак у першыя стагоддзі хрысціянства, таму што новая вера - не дзікія забабоны, а глыбокая філасофская і маральная сістэма.

- Што з'яўляецца спрадвечным элементам кожнай рэлігіі?

-Вера.

Настаўнік. Нароўні з простай і пачуццёвай верай ёсць сістэматычная, адмыслова распрацаваная для дадзенай рэлігіі сукупнасць прынцыпаў, ідэй, паняццяў, яе навукі.

- Без чаго не можа існаваць рэлігія?

=Рэлігія не можа існаваць без рэлігійнай дзейнасці.

Настаўнік.Падчас адпраўлення культаў і ўсёй сваёй рэлігійнай дзейнасці людзі яднаюцца ў супольнасці, што завуцца цэрквамі.

Вывад. Рэлігія - прадукт развіцця чалавечай свядомасці.

Настаўнік. Беларусь - краіна, што адрозніваецца вялікім шанаваннем духоўных святыняў. Ёсць у Рэспубліцы нямала выдатных храмаў, цэркавак, капліц і каплічак. З веку ў век над краінай разносіцца ўрачысты звон...

Святыні — гэта прадмет ці месца рэлігійнага шанавання. У вернікаў – прадмет рэлігійнага шанавання (цэрквы, храмы, манастыры і г. д.), усё, чаму ў праваслаўі прынята аддаваць гонар шанавання. Гэта прадметы , злучаныя з шанаваннем Божай Маці, святыя і цудадзейныя абразы, мошчы святых. Месцы, што адносяцца да жыцця святых, і іх асабістыя рэчы. Святыя крыніцы, прыстанкі, магілы святых людзей, ушанаваных царквой.

Нягледзячы на цяжкае мінулае, у Беларусі захавалася мноства святых месцаў, якія могуць расказаць усё пра яе гісторыю. І ўсё гэта святыні Беларусі. Такім чынам, вандраванне пачынаецца!

Дзеці, уявіце сабе, што да вас прыехалі госці з-за мяжы, якім трэба паказаць праваслаўныя святыні Гродзеншчыны і расказаць пра іх. Вядома, для турыстаў існуе мноства магчымасцяў наведаць святыя беларускія месцы, захапіцца іх строгай прыгажосцю і правесці духоўны адпачынак у Беларусі.

Такім чынам я прапаную адправіцца ў завочную экскурсію па святых месцах Гродзеншчыны.

Настаўнік. На слайдах змешчаны апісанні праваслаўных святынь. Патрэбна пазнаць, пра якую святыню Гродзеншчыны ідзе размова. А затым вучні, якія атрымалі папераджальнае заданне, прапануюць нам кароткі экскурс у гісторыю пэўных аб’ектаў.

Заданне 1. Самы старажытны на Гродзеншчыне манастыр. Манастырскае жыццё вакол царквы ў гонар першых рускіх святых Барыса і Глеба, што да сённяшняга дня стаіць на правым беразе Нёмана, зарадзілася вельмі даўно. Царква была ўзведзена ў 12 ст. князем Мсціславам Усеваладавічам. Уяўляе сабой помнік у стылі візантыйскага і старажытнарускага дойлідства з мясцовымі архітэктурнымі асаблівасцямі. Храм аднакупальны, трохнефавы, на 5 слупах. Быў аздоблены фрэскавым роспісам, які не захаваўся. З левага боку размяшчаўся ўваход у склеп-пахавальню. Скляпенні і верхняя частка сцен былі знішчаны пры асадзе Гродна каралём Карлам XII.

Адказ. Барыса-Глебская, Каложская царква. (Фота 1.)

Дадатковае паведамленне вучня. З гісторыі царквы.

Мужчынскі манастыр пры царкве заснаваны каля 1480 г. Захавалася дакументальнае сведчанне, што ў гэтым годзе вялікі князь літоўскі Аляксандр з жонкай Аленай падаравалі манастыру сад каля Каложы. Вялікія зямельныя надзелы ахвяраваў манастыру шляхціц Богуш-Багавіцінавіч, аб чым сведчаць пісьмовыя дакументы. Ён грунтоўна аднавіў царкву святых Барыса і Глеба ў пачатку 16 ст. пасля разбурэння яе крыжакамі. Паводле завяшчання, быў пахаваны у гэтай жа царкве каля алтарнага слупа. Значную падтрымку манастыру аказвалі вялікі князь Аляксандр і кароль Жыгімонд I Стары. Вялікай павагай і ўшанаваннем вернікаў карысталася цудадзейная Каложская ікона Божай Маці, якая знаходзілася ў Барыса- Глебскай царкве. У другой палове 16 ст., карыстаючыся правам патранату, манастыром кіравалі свецкія людзі. У дакументах згадваецца, што яны разганялі манахаў, пазбаўлялі яго маёмасці. Пастановай сейма 1635 г. манастыр быў падпарадкаваны уніятам, належаў віленскім базыльянам.



Фота 1.Барысаглебская царква.

Знішчальныя войны 17 ст. давялі манастыр да заняпаду. Маскоўскія войскі Івана Васільевіча выкарыстоўвалі Барыса-Глебскую царкву як артылерыйскі плацдарм для абстрэлу гродзенскага замка. У 1839 г. пасля скасавання уніі манастыр вернуты ў праваслаўе. На той час у манастыры знаходзілася 15 манахаў. Манаскія келлі былі драўляныя, размяшчаліся вакол Барыса-Глебскай царквы.

З 18 ст. над царквой навісла пагроза абвалу сцен з-за падмыву берагоў

Нёмана. У 1843 г. з гэтай прычыны яна была зачынена. У 1853 г. паўднёвая сцяна і частка заходняй абваліліся ў Нёман. З гэтага часу манастыр быў пераведзены ў будынкі былога каталіцкага манастыра бернардзінак, туды ж перанесена і цудадзейная ікона Божай Маці.

У пачатку 20 ст. у манастыры дзейнічалі тры храмы: мураваны Барыса-Глебскі (1612) з цудадзейнай Каложскай іконай Божай Маці, дамовы ў гонар свяціцеля Мітрафана Варонежскага (1859) і трапезны ў імя святога Афанасія Брэсцкага (1893). Пры манастыры дзейнічаў прытулак для малалетніх сірот і царкоўнапрыходская школа.

У новых будынках пры манастыры знаходзілася рэзідэнцыя Брэсцкіх епіскапаў. Пры епіскапе Іосіфе Сакалове была пабудавана новая царква ў гонар святога Афанасія, ігумена Брэсцкага. Дзякуючы намаганням епіскапа пачалася адбудова старажытнай Барыса-Глебскай Каложскай царквы. У 1915 г. з пачаткам першай сусветнай вайны манастыр быў эвакуіраваны ў глыб Расіі. Манахі забралі з сабой і цудадзейную ікону. Назад у Гродна яны ўжо не вярнуліся. Страчаны след і цудатворнай святыні.

Старажытная Барыса-Глебская царква ў савецкі час была закрыта, у 1948 г. перададзена гісторыка-археалагічнаму музею. У 1990-я гг. тут адноўлены праваслаўны прыход. Пры ім створана брацтва, якое займаецца асветніцкай і сацыяльнай дзейнасцю.

Заданне 2. Згодна з гістарычнымі дакументамі, пабудавана ў 15 ст., але паданне адносіць яе заснаванне да ранейшых часоў. Царква нагадвае сярэднявечныя крэпасці, уяўляе сабой трохнефную, трохапсідную пабудову зальнага тыпу з прытворам, узведзеным не пазней за 16 ст. Архітэктура царквы сведчыць, што яна прызначалася не толькі для малітвы, але служыла сховішчам мясцоваму насельніцтву ў час спусташальных войнаў і рабаванняў.

Адказ. Зэльвенскі раён, в. Сынковічы. Царква ў гонар архістраціга Міхаіла.

Дадатковае паведамленне вучня. З гісторыі царквы.



Будынак Сынковіцкай царквы складзены з

трывалай цэглы чырвонага колеру, кладка ў некалькі слаёў. Па кутках будынка — чатыры вежы, у якія вядуць асобныя хады са спецыяльнымі мураванымі лесвіцамі. У падвойных сценах знаходзіўся таемны ход, які ішоў вакол усяго будынка і вёў да кожнай з чатырох кутавых вежаў. 3-за вялікай таўшчыні сцен і вострага даху грандыёзная звонку царква не вельмі ўмяшчальная ўсярэдзіне. Царкоўныя скляпенні абапіраюцца на чатыры квадратныя слупы. Алтаром царква павернута на ўсход. Прастол у ёй адзін, асвячоны ў гонар архістраціга Міхаіла. Дзякуючы руплівацi святароў і дапамозе вернікаў храм падтрымліваўся на працягу стагоддзяў у добрым стане.

Фота 2.Царква ў в.Сынкавічы, Слонімскі раён.

У канцы 19 ст. у прыходзе дзейнічалі брацтва, царкоўнапрыходскае апякунства (з 1870), 2 царкоўныя школы пісьменнасці ў вёсках Хадзевічы і Ярнева, адно народнае вучылішча ў Казловічах.

У 19 ст. у царкве знаходзілася цудатворная Чанстахоўская ікона Божай Маці з мноствам яшчэ з даўніх часоў прывесак — знакаў асаблівай пашаны вернікаў, якія звярталіся да яе за дапамогай. Памерам ікона была вялікая, напісаная на палатне, наклееным на дубовай тоўстай дошцы вагой да 2 пудоў.

У 1890-х гг. Маскоўскім археалагічным таварыствам выдадзены летапіс Сынковіцкага храма, складзены святаром Мікалаем Сыантовічам. У 1904 г. настаяцелем царквы Канстанцінам Нікольскім былі адкрыты яшчэ два вучылішчы, у якіх навучалася 158 вучняў.

30 сакавіка 1959 г. улады зачынілі Сынковіцкі храм, нібы з-за «поўнай нягоднасці» будынка. Прыход у Сынковічах быў адноўлены ў 1992 г. У галоўных рысах (сцены, скляпенні, вежы) Сынковіцкая царква захавалася да нашага часу, лічыцца помнікам архітэктуры сусветнага значэння.

Заданне 3. Манастыр узнік на месцы, дзе, паводле падання, у 1470 г. цудоўным чынам з'явіўся абраз Маці Божай. Манастыр быў заснаваны ў канцы XV ст. як праваслаўны. У 1613 г. перайшоў у рукі базыльянаў (манахі грэка-каталіцкай Царквы), якія адрадзілі культ Маці Божай і зрабілі манастыр галоўным цэнтрам

Уніі. Першым ігуменам манастыра ў часы Уніі быў Іасафат Кунцэвіч. Намаганнямі базыльянаў за часы Уніі быў узведзены вялікі манастырскі комплекс з мураваных храмаў барочнай архітэктуры. У 1730 г. у прысутнасці дзясяткаў тысяч католікаў візантыйскага і лацінскага абраду, а таксама іншых вернікаў цудатворная ікона Маці Божай з манастыра была ўрачыста каранавана залатымі папскімі каронамі, а Маці Божая Жыровіцкая абвешчана апякункай і заступніцай беларускага народа.

Адказ. Жыро́віцкі Свята-Успенскі манасты́р — мужчынскі.

Дадатковае паведамленне вучня. З гісторыі манастыра.

Свята-Успенскі сабор у Жыровічах з'яўляецца галоўным храмам Жыровіцкага манастыра і менавіта ён даў назву ўсяму прыстанку (поўная назва манастыра – Свята-Успенскі Жыровіцкі мужчынскі манастыр). За гэты велічны і вялікі храм трэба дзякаваць ігумену Пятру Мімонскаму, бо менавіта яго стараннямі Свята-Успенскі сабор у 1629-1671 гадах быў пабудаваны.



Сёння Свята-Успенскі сабор у Жыровічах - помнік архітэктуры стыляў барока, ракако і класіцызму. Аднак спачатку храм будаваўся ў барочным стылі і меў тры купалы. Уражвалі і памеры сабора : у вышыню ён дасягаў 40 метраў, у даўжыню – 55.

Па задуме архітэктараў, алтар храма ўзвышаўся ў дакладнасці над месцам, дзе адбылася цудоўная з'ява абраза Жыровіцкай Божай маці. Паводле легенды, абраз быў знойдзены каля грушы пастушкамі. На тэрыторыі сабора захаваўся корань гэтай грушы, змешчаны ў адмыслова ўладкаванай нішы. Разам з коранем дрэва, у нішы знаходзіцца студня,

што захоўвае выток крыніцы, якая некалі біла з-пад гэтай грушы (сёння ніша знаходзіцца злева ад уваходу ў сабор).

*Цудадзейны абраз Жыровіцкай Божай Маці з'яўляецца самай ушанаванай святыняй манастыра і самай маленькай у свеце з ушанаваных абразоў Багародзіцы. Памер абраза 5,6*4,4 см, практычна дзіцячая далонька. На абразе яснаадрозныя расколіны – вынік пажару , у якім пацярпела святыня (у падзяку за выратаванне абраза была збудавана Богаяўленская царква).*

У 17-18 стагоддзях пад алтарнай часткай Свята-Успенскага сабора знаходзілася братэрская капліца - магільны склеп , дзе хавалі як манахаў, так і многіх знакамітых духоўных асоб таго часу (так, тут быў пахаваны архібіскуп Іосіф Кунцэвіч). Аднак у першай палове 19 стагоддзя магільны склеп была замуравана і з той пары манахаў сталі хаваць на братэрскіх могілках.

Сёння Свята-Успенскі сабор у Жыровічах узначальвае архітэктурны комплекс манастыра. Сіні купал храма бачны за шмат кіламетраў ад Жыровіч. Нягледзячы на значныя вонкавыя перабудовы храма, усярэдзіне Успенскі сабор у Жыровічах захаваў барочную архітэктуру. Цэнтральны дэкаратыўны элемен храма – гэта трох'ярусны драўляны іканастас 17 стагоддзя, выкананы ў барочным стылі. Для яго роспісу ў 1779 годзе быў запрошаны майстар Рыгор Мядзвецкі.

Свята- Успенскі сабор у Жыровічах захоўвае мноства святыняў, ушанаваных праваслаўнымі вернікамі: цудадзейныя міраточныя абразы, мошчы святых, крыжы… Таму няма дзіва, што паломніцкія туры па Беларусі ў першую чаргу асацыіруюцца з наведаннем Жыровіцкага манастыра і яго галоўнага храма – Свята-Успенскага сабора.

Заданне 4. Храм узведзены ў 1672 годзе на месцы драўлянай царквы 16 стагоддзя. Сёння царква з’яўляецца самым старым будынкам манастыра. Пабудавана яна на месцы другога з’яўлення знакамітай **іконы Божай Маці.**

Адказ. Богаяўленская царква ў Жыровічах.

Дадатковае паведамленне вучня. З гісторыі царквы

Богаяўленская царква ў Жыровічах (іншыя назвы – Свята-Яўленская царква ў Жыровічах, Яўленская царква ў Жыровічах) з'яўляецца помнікам архітэктуры стылю барока. Рэч у тым, што цудадзейны Жыровіцкі абраз пасля пажару 1520 года знік. Знайшлі яго сялянскія дзеці на схіле ўзгорка недалёка ад згарэлага храма, у якім абраз знаходзіўся. Кажуць, што спачатку яны ўбачылі дзяўчыну незвычайнай прыгажосці, якая сядзела на камені, з якога ішло свячэнне. Калі ж дзеткі прывялі да месца святара, то дзяўчыны не было, затое на камені ляжаў зніклы абраз. На гэтым месцы царкву і ўзвялі.

У 1796 годзе царква была перабудавана. У 1870-х гадах храм зведаў чарговую архітэктурную змену, у выніку якой ля царквы з'явіўся элемент псеўдарускага стылю – цыбульная частка.

У Вялікую Айчынную вайну нямецка-фашысцкія захопнікі ўладкавалі ў храме склад боепрыпасаў. І ў сувязі з гэтым расказваюць наступную легенду: аднойчы, калі ахова адпачывала ля дзвярэй замкнёнага на замок храма-склада, на ганку невядома адкуль з'явілася кабета і на чыстай нямецкай мове загадала захопнікам прыбірацца. Праз імгненне кабета знікла за дзвярамі храма, на якім па-ранейшаму вісеў замок. Калі ахоўнікі адкрылі храм, то ўсярэдзіне нікога не знайшлі. Але на абразе, што паказваў Багародзіцу, пазналі незнаёмую. Сімвалічна, але ў той жа дзень гарнізон змушаны быў пакінуць Жыровіцкі манастыр.

Унутраны аб'ём царквы невялікі, амаль палову яго прасторы займае алтарная частка, у якой знаходзіцца камень з'явы Багародзіцы. Камень асвячоны ў якасці Святога пасада. У 2000 годзе ў царкве з'явіўся разьбяны іканастас, аднак электрычнага асвятлення па-ранейшаму няма.

У падалтарным крыпце храма ў 1881 годзе быў пахаваны мінскі архібіскуп Міхал Галубовіч – сябар і памагаты мітрапаліта Іосіфа Сямашкі ў справе ўз'яднання ўніятаў.

Богаяўленская царква ў Жыровічах з'яўляецца часткай знакамітага Жыровіцкага манастыра, а таму не абдзелена ўвагай пілігрымаў і вернікаў. У Жыровічы арганізуюцца такія паломніцкія туры як «Свята-Успенскі Жыровіцкі манастыр – апора праваслаўя на Беларусі», «Свята-Успенскі Жыровіцкі манастыр. Праваслаўныя храмы Слоніма і іншыя.

Заданне 5.

Важнае месца сярод святыняў Беларусі займае гэта царква Раства Багародзіцы. Помнік напамінае ўмацаваны замак, які пабачыў досыць на сваім веку. Па звестках, у 1656 годзе, падчас вайны з Маскоўскай дзяржавай, атрад казакоў разрабаваў храм, а падчас руска-польскай вайны царква была моцна пашкоджана.

Адказ. Царква Раства Багародзіцы (яе яшчэ завуць Мураванкаўскай ці Маламажэйкаўскай).



дзіцы . ў в.

Дадатковае паведамленне вучня.

З гісторыі царквы

Помнік гатычнай-рэнесанснай архітэктуры. Пабудавана паміж 1516 і 1524 гадамі на сродкі мясцовага памешчыка Шымкі. З 1864 г. пры царкве працавала царкоўна-прыходская школа, пасля пажару жыхары пабудавалі пры царкве вучэльны дом. Перад Першай сусветнай вайной тут былі тры царкоўна-парафіяльныя школы: у Мажэйках, Шпільках і Агародніках. У 1906 годзе на сродкі Віленскага Свята-Духава брацтва царква была адрамантавана. У 1915 годзе ў храме ўтрымвалі палонных. У 1928 годзе царква адабрана ў праваслаўных польскімі ўладамі і пераасвячоная ў касцёл. У 1993 годзе вернута праваслаўным, стала цэнтрам прыходу, які аб'ядноўвае 8 вёсак. Пры царкве арганізавана нядзельная школа.

Царква ўяўляе сабою зліццё гатычнай і рэнесансавай архітэктуры. У храме знаходзіцца асаблівая цэгла «царская лілея» (знак чысціні Богамаці), таму царква і названа ў гонар Раства Найсвятой Багародзіцы. Існуе шмат легендаў пра падземныя хады храма.

Настаўнік. На працягу тысячагадовай гісторыі Праваслаўнай царквы ў розныя часы праславіліся сваім жыццём угоднікі Божыя, якія ўшаноўваюцца нашым народам як заступнікі і малельнікі за нас, зямных суродзічаў, і за нашу Бацькаўшчыну.

Традыцыя ўшанавання святых заўсёды была неад'емнай часткай духоўнага жыцця беларускага народа. Для кожнага з беларускіх святых усталяваны дзень памяці, акрамя гэтага, у 3-ю нядзелю пасля Пяцідзясятніцы (Троіцы) адзначаецца святкаванне Сабора беларускіх святых.

А цяпер вашай увазе прэзентацыя пра святых гродзенскай зямлі.



Святыя Антоній, Іаан і Яўстафій.

У 19 ст. у Гродне быў храм у гонар першых хрысціянскіх мучанікаў на беларускіх землях — **святых Антонія, Іаана і Яўстафія**.

ана і

Глыбока ўшаноўваюцца святыя мучанікі на Гродзеншчыне і сёння. Антоній, Іаан і Яўстафій пацярпелі за Хрыста пры вялікім князі літоўскім Альгердзе ў 1347 г. у Вільні. Два прыдворныя князя, родныя браты Няжыла і Кумец, тайна прынялі ад святара Нестара хрышчэнне і атрымалі імёны Антоній і Іаан. Праз нейкі час князь абвінаваціў братоў у адступніцтве ад паганства, яны публічна прызналі сябе хрысціянамі. Князь загадаў пасадзіць іх у вязніцу. Натоўпы народу прыходзілі туды, каб пачуць пропаведзі мучанікаў, і шмат каго святыя браты звярнулі да Хрыста. Напалоханыя паганскія жрацы па- трабавалі

пакарання братам. Раніцай 14 красавіка (27 красавіка па н. ст.) 1347 г. мучанік Антоній быў павешаны на дубе, 24 красавіка загінуў святы Іаан, а цела яго было павешана на тым самым дубе.

Трэцім мучанікам за веру Хрыстову стаў Круглец. Пры хрышчэнні святар Нестар даў яму імя Яўстафій. Аднойчы ён прылюдна вызнаў сябе хрысціянінам, адмо- віўшыся есці мяса з прычыны посту. Яго жорстка ката- валі, пасля чаго павесілі на тым самым дубе, дзе раней прынялі мучаніцкую смерць Антоній і Іаан. Адбылося гэта 13 снежня 1347 г.

